КАБ ШКОЛЫ НЕ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ НАСТАЎНІКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тады і праблема адтоку адораных дзяцей у іншыя навучальныя ўстановы ўзнікаць не будзе.

— Мы неаднаразова ўзнімалі праблему захавання падрыхтаванай інтэлектуальнай эліты, — дадаў Міхаіл Мірончык. — Нават сёлетнія пераможцы міжнародных алімпіяд сталі студэнтамі не толькі нашых ВНУ, а паступілі ў ВНУ краін як блізкага, так і далёкага замежжа. Лічу, каб сітуацыю змяніць, трэба не толькі даваць вучням бліскучыя веды, але і выхоўваць у навучэнцаў грамадзянскую адказнасць перад настаўнікам, школай, горадам і краінай за рэалізацыю свайго інтэлектуальнага патэнцыялу.

Для выхавання будучай эліты патрэбны кадры вельмі высокай кваліфікацыі. Яны ёсць сярод нашых настаўнікаў і ўніверсітэцкіх выкладчыкаў. Іх імёны шырока вядомыя: Лаўрыновіч Леанід Іванавіч, Камракоў Барыс Барысавіч, Мазанік Сяргей Аляксандравіч, Хвалюк Віктар Мікалаевіч і іншыя. Але хто прыйдзе ім не змену? Вельмі трапна сказаў не так даўно кіраўнік нашай дзяржавы пра тое, што калі таленавіты хірург не падрыхтаваў сабе падобных, значыць, сваю прафесійную місію ён выканаў не да канца. Мяркую, што ў поўнай ступені гэта тычыцца і настаўніцтва. Тым больш што пытанне пра стварэнне школ «зорных» настаўнікаў ставілася неаднаразова. Лічу, што ўсім нам работу ў гэтым кірунку трэба ўжо не проста актывізаваць, а фарсіраваць. Варта таксама прызнаць, што мы далёка не ў поўнай ступені выкарыстоўваем магчымасці Мінска для прыцягнення знешніх інтэлектуальных рэсурсаў для вырашэння задач па павышэнні якасці адукацыі...

Фізіка ці філалогія? Выбірай...

Найбольш сур'ёзныя змяненні ў арганізацыі і змесце адукацыйнага працэсу ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі адбудуцца ў новым навучальным годзе на трэцяй ступені ў сувязі з увядзеннем вывучэння асобных прадметаў на павышаным узроўні. Прыкладна восем гадоў таму ў сталіцы дыферэнцыраваным навучаннем на старшай ступені школы былі ахоплены 82% навучэнцаў. На павышаным і паглыбленым узроўнях прадметы вывучаліся больш чым у 90% устаноў. Класы фізіка-матэматычнай накіраванасці былі ў 70 установах адукацыі, а хіміка-біялагічныя класы — у 23.

З 1 верасня ў Мінску па новых вучэбных планах будуць працаваць 94 дзясятыя класы, або трэцяя частка ад іх агульнай колькасці, у тым ліку 37 фізіка-матэматычных класаў, 5 класаў хіміка-біялагічнай накіраванасці, 39 — філалагічнай і 8 — грамадазнаўчай. А ў 169 дзясятых класах усе прадметы будуць вывучацца на базавым узроўні. Аднак так званыя «профільныя» класы размеркаваліся па горадзе нераўнамерна (ёсць раёны, дзе адсутнічаюць, скажам, фізіка-матэматычныя класы або класы грамадазнаўчай накіраванасці), паколькі для адкрыцця такіх класаў патрабавалася наяўнасць развітой адукацыйнай інфраструктуры, педагагічных кадраў і зацікаўленасць з боку вучняў і іх бацькоў.

— Каб атрымаць станоўчы адукацыйны эфект, неабходна вывучаць запыты старшакласнікаў і іх бацькоў і распрацаваць парадак і крытэрыі прыёму ў класы з павышаным узроўнем навучання прадметаў, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Міхаіл Мірончык. — А што тычыцца павышэння якасці і эфектыўнасці факультатыўных заняткаў у школах, то тут, мяркую, перш за ўсё, трэба змяніць псіхалогію і настаўнікаў, і кіраўнікоў установы адукацыі: факультатывы павінны быць не сродкам для павелічэння заработнай платы педагогам, а магчымасцю для навучэнцаў рэалізаваць іх права на развіццё інтарэсаў і здольнасцяў.

Чаму не затрымліваюцца маладыя педагогі?

Адукацыйны працэс у сталічных установах адукацыі ажыццяўляюць сёння 30,7 тысячы педагагічных работнікаў. 89,3% педагогаў, якія працуюць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, маюць вышэйшую педагагічную адукацыю. **Разам з тым, у горадзе канстатуюць высокую змяняльнасць маладых настаўнікаў — 45% штогод!** Хвалюе кіраўніцтва сталічнай сістэмы адукацыі і адсутнасць ахвотных паступаць на педагагічныя спецыяльнасці.

— Заўтра можа скласціся сітуацыя, калі ў школу не прыйдуць дыпламаваныя настаўнікі матэматыкі, фізікі, пачатковых класаў і іншыя. Праблема — у нізкім сацыяльным статусе настаўніка. Таму горад выходзіць з ініцыятывай адрадзіць у сталіцы педагагічны каледж, дзе будуць рыхтаваць настаўнікаў пачатковай школы і выхавальнікаў для дашкольных устаноў, — паведаміў Міхаіл Мірончык.

Між іншым, у дашкольных установах горада вышэйшую спецыяльную педагагічную адукацыю маюць толькі 30,3% педагогаў...

Яшчэ адна праблема — змяняльнасць кіраўніцкіх кадраў. У апошнія гады яна ўзрасла па ўсіх катэгорыях кіраўнікоў.

— Безумоўна, ратацыя непазбежная, а прыход моладзі ў сферу кіравання — працэс натуральны і неабходны, — лічыць кіраўнік сістэмы адукацыі. — Маладыя кіраўнікі — мабільныя, па-добраму амбіцыёзныя, адчувальныя да ўсяго новага. Аднак часта гэтыя якасці нават не паспяваюць атрымаць свайго развіцця. Найбольш трывожная сітуацыя складваецца з намеснікамі дырэктараў па выхаваўчай рабоце, дзе летась змяніўся кожны чацвёрты з іх. Як наступства — такі ж высокі паказчык змяняльнасці спецыялістаў, якія знаходзяцца ў непасрэдным іх падпарадкаванні. Пагадзіцеся, што ў такой сітуацыі наўрад ці можна сур'ёзна паўплываць на якасць і вынікі выхаваўчага працэсу.

Міхаіл Мірончык паведаміў, што з гэтага навучальнага года ў Мінску стартуе праект «Электронная школа», які дазволіць аптымізаваць унутрышкольны дакументаабарот. Педагогі змогуць у рэжыме анлайн прасочваць індывідуальную траекторыю навучання школьнікаў, а бацькі атрымаюць рэальную карціну вучэбных дасягненняў свайго дзіцяці. Новы ІТ-праект патрабуе ад кіраўнікоў высокага ўзроўню валодання інфармацыйнымі тэхналогіямі, але актыўнай зацікаўленасці з боку кіраўніцкіх кадраў авалодаць імі не назіраецца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сяргей РУБЛЕЎСКІ

РАЙ НА ЗЯМЛІ

ЛЮДЗІ аніяк не могуць даць сабе веры, што Бог, раззлаваны на свавольных Адама і Еву, беззваротна выгнаў абаіх і ўсіх нашчадкаў — гэта значыць, нас з вамі — з раю. Асабліва — жанчыны: у іх карацейшая памяць на грэх. Да таго ж гэтае нявер'е зноў і зноў падсілкоўваецца хараством ды асалодай, якія кладуцца на душу залатымі зараніцамі не надта асэнсаванага, але такога жывога і пераканаўчага вобраза раю.

Закаханаму юнаку, уджаленаму пацалункам красуні, здаецца, што мінулага няма, а ёсць толькі будучыня — бязмежная, як вечнасць.

Выведзены подручкі на сонечны прыгрэў зусім нямоглы дзядок згадвае на прызбе мінулае і, ачмурэлы ад свежага водарнага паветра і спеву птушак, раптам адчувае, што не баіцца смерці... Хіба можа такое хараство назаўсёды заплюшчыць сваю зыркасць сённяшняй, як і ўчора маючай быць балючай, ночкай?!

Мурзаты хлапчук, які ў цесным коле сябрукоў пруточкам выкочвае з гарачага прысака свежаспечаную бульбіну, а тады похапкам, перакідваючы яе з далоні на далонь, трохі астуджвае, абірае і, апякаючы язык і паднябенне, бо не церпіцца, таропка есць, каб не прапусціць смак маленства...

Апантаны рыбалоў на гумавай лодцы, нібы на ўдала прынесенай ветрам лісцінцы, з натхнёным сэрцам аддаецца рачной плыні і, зачараваны чысцінёй і хараством свету, узрушаны таямніцай блізкай прысутнасці шчупакоў, раптам заўважае, што час для яго, у адрозненне ад ракі, не цячэ, а сашчыльніваецца ў адно імгненне. Дзень-імгненне роўны вечнасці, якая хутка праходзіць...

Дзяўчыне, якая забылася на сябе ў любошчах, здаецца, што яе няма, як учарашняй веснавой пупышкі — раскрылася, і толькі гарачыя, пяшчотныя вусны каханага даюць шчаслівыя знакі вяртання з забыцця...

Колькі іх, такіх нязгасных у памяці водбліскаў раю, якія абачлівыя людзі называюць «шчаслівымі імгненнямі»!

Уяўленне пра ніколі не бачаны, але, здаецца, такі магчымы рай заўсёды звязана з часам, пераканаўчай прыкметай Божай прысутнасці ў нашым жыцці.

Гэтая акалічнасць была ўдала скарыстана архітэктарамі камунізму, запраектаванага як шырока адкрыты для ўсіх рай на зямлі. А больш дакладна, маючы быць шырока адкрыты ў «светлай будучыні».

Рай — заўсёды абяцанне. Сучаснасць толькі напаўняе душу неўміручай надзеяй.

Прайшло столькі гадоў, а я не магу дараваць запальчываму і няўседліваму, «тропку бліну», як у нас кажуць, Мікіту Хрушчову за тое, што ён здратаваў, спаліў і попелам развеяў светлую, як абяцаная будучыня, надзею мільёнаў і мільёнаў людзей. У тым ліку і маю. Гэта ж трэба, у першай палове 1960-х гадоў заявіць, што камунізм у СССР будзе пабудаваны к 2000 году. На той час вучань малодшых класаў, я і па сёння добра памятаю падручнік, фарзацы якога спрэс былі задрукаваны карцінкамі будучага бестурботнага жыцця з адпаведнымі подпісамі да іх. Шматпавярховыя гмахі — кожнаму будзе па бязвыплатнай кватэры, карпусы курортаў — кожны ўлетку будзе млець у салодкай стоме на цёплым марскім пясочку... Ну і гэтак далей.

А дзе тое? Пытанне зусім не рытарычнае пасля стольких чалавечых ахвяр, пакладзеных на алтар камунізму. Даўно мінуў 2000 год, а цудадзейныя перамены не толькі не адбыліся, але, наадварот, будаўнічая пляцоўка «светлай будучыні» ўшчэнт разрабавана, вокны і дзверы з незавершаных муроў павыдзіраны з коранем ды разнесены па сядзібах...

А трэба было не хваліцца загадзя, не абвяшчаць тэрмін спраўджвання мары і надзеі!

Праўда, Мікіта — буду справядлівым — у свой час вельмі ўсцешыў мяне з сябрукамі. Апантаны кукурузалюб, «каралеву палёў» ён патрабаваў садзіць у калгасах квадратна-гнездавым спосабам, а не высяваць сеялкай, як цяпер. Тоўстыя пругкія сцёблы, з якога боку ні глянь, стаялі роўненькімі радочкамі, густое лісце давала прахалодную засень, сакаўныя кіяхі спакуслівa тырчэлі на сцёблах у розных бакі: адламай, аблушчы і пакаштуй малочныя салодкія зярняты... Мяцёлкі кукурузы былі куды вышэй ад нашых стрыжаных галоў, але я і дагэтуль не ведаю, вялікі быў тады ўраджай ці так сабе. Таму што сам быў маленькі...

О, як мы, жэўжыкі, бегалі па тых кукурузных радах, аж трэтар ішоў! Як гулялі ў хованкі — не знайсці, ды і самому лёгка было згубіцца ў паглынальнай зеляніне так, што даводзілася перасякаць усё поле, каб выбіцца на які ўскраек...

Кукурузнае каралеўства ад Мікіты Хрушчова было для нас, акцябрат і піянераў, дзівоснай райскай купінай. Але што ж гэта за рай, з якога нават не Бог, а час выганяе адразу, як толькі заканчваецца дзяцінства...

Апроч самага распаўсюджанага абяцання раю на тым і на гэтым свеце, калі вызначальным фактарам з'яўляецца якраз час (трэба толькі дачакацца!), ёсць і прасторавы спосаб, прытым не абяцання, а рэальнага пошуку і заснавання раю на зямлі. Тэрмін для гэтага патрабуецца непараўнальна меншы. У некаторых выпадках гэты спосаб больш дакладна назваць геаграфічным.

Нават манахі, Божыя служкі, якія даводзяць да ладу свой прытулак, прымерваюцца не інакш як да намаляванага ўяўленнем, з падказкі Бібліі, вядома, райскага куточка.



Мікалаюс-Канстанцінас Чурлёніс. «Рай».

Ды і ў звычайных людзей тое самае. Шмат хто імкнецца атрымаць добры надзел на беразе ракі ці возера і каб яшчэ лес ці якія зараснікі нерушныя падступалі да самай мяжы, збудаваць церамок, а на двары, замкнёным ад суседзяў высокай агароджай, пасадзіць сартавыя, каб на ўсю шапку, ружы, дзівосныя, прывезеныя з-за мора дрэвы і хмызы, а яшчэ паставіць агромністы вальер з высакароднымі прыгажунамі аленямі, а на волю выпусціць злых, мардатых, са зверскім выскалам, але ласкавых да сваіх сабак... Некаторыя людцы агароджу ўзводзяць такую шчыльную і высокую, што, здаецца, і сам Бог не пералезе. І тут дарэчы згадаць выказванне аднаго знаўцы іўдзейскага містычнага вучэння Кабалы: гэта не Бог, сцвярджае ён, выгнаў Адама і Еву з раю, а, наадварот, Адам адтуль выгнаў Яго...

Што да гэаграфічных пошукаў раю, дык самай запамінальнай такой спробай з'яўляецца марская экспедыцыя Хрыстафора Калумба ў 1492—1493 гг. Хачу звярнуцца не да гістарычных хронік, а да славутага рамана аргенцінскага пісьменніка Абеля Пасэ «Райскія сабакі». Паводле гэтага цікавага твора, Хрыстафор адправіўся ў сваё далёкае падарожжа з блаславення абазнаных у старажытным таямнічым вучэнні адзінаверцаў. Яўрэі тады цярпелі вялікі націск ад іспанскіх улад: іх пад прымусам абавязвалі прымаць хрысціянства, пагражалі выгнаннем з краіны, што і адбылося акурат у 1492 годзе, калі караблі Калумба былі ў далёкай экспедыцыі. Дык, натуральна, што ён, патаемны іўдзей, яшчэ не ведаў пра трагедыю сваіх адзінаверцаў і зацята, з зайздроснай рашучасцю і мужнасцю вёў караблі, каб выканаць у тым ліку і іх наказ. У прадчуванні бяды духоўныя старэйшыны яўрэяў загадалі яму адшукаць прыдатны зямны куток для свайго народа, каб у выпадку рэпрэсій у Іспаніі знайсці прытулак хоць на краі свету. Зазначу, што спрактыкаваны ў марской справе Хрыстафор плыў не наўгад, куды вочы глядзяць, а вызначыў курс з улікам свайго стараннага даследавання накіду карты фларэнтыйскага географа і касмагона Паола Тасканэлі. Накід дзякуючы выпадку патрапіў яму ў рукі.

Калі 12 кастрычніка 1492 года Калумб нарэшце ступіў на востраў Сан-Сальвадор Багамскага архіпелага, дык ачмурэлы ад радасці, адразу прызнаў: вось ён, той шуканы нерушны прытульны куток, сапраўдны рай на зямлі!

Высока ў небе шчодрылася зыркае сонца, з галіны на галіну павольна пераляталі нібы адмыслова размаляваныя ўспрытнёнымі мастакамі да свята птушкі, на дрэвах віселі невядомыя дагэтуль сакаўныя плады... «Бог напуціў мяне. Бог ведае, якога куточка на зямлі варты мой гнаны народ...» — падумаў Калумб.

Чым далей ад берага ён з камандай заходзіў у глыб вострава, тым больш і больш поўніўся пераканаццем: ну так і ёсць, гэта рай на зямлі. Нарэшце знойдзены!

Традыцыйна амаль што цалкам аголеных зычлівых, гасцінных тубыльцаў Хрыстафор, калі верыць Абелю Пасэ, прыняў не інакш як за цемнаскурых анёлаў. Дык і сам скінуў з сябе вопратку і загадаў тое самае зрабіць камандзе: у раі — які грэх, які сорам, усё — у мінулым!..

А тады Хрыстафор папрасіў паказаць яму самае вялізнае дрэва на востраве — і Калумба прывялі да яго. Вось яно — Дрэва жыцця! Магутны, глыбока ўкаранёны ствол, разгалістая крона з чароўным пошумам лісця ды спевам птушак, які, здаецца, навечна заблытаўся ў густых тонкіх галінках. Самае месца для марскога гамака стомленага карабельнага стырнавога. Лацвей падвязаць яго на тоўстых ніжніх суках...

Калумб так і зрабіў, а тады лёг у хісткую люльку даверліва, як дзяцёнак, якога пахінула на сон. Вейкі яго і сапраўды пачалі зліпацца, а сон — барляць у свядомасці рэальнасць і ўяўленне пра яе...

Каманда тым часам, скарыстаўшы момант, узялася за звыклую справу: новаспечаныя каланізатары пачалі рабаваць і гвалціць тубыльцаў, абладжваючы сваё часовае жыццё па ўзоры Садома і Гаморы.

Калі мы адкладзём у бок раман Абеля Пасэ і звернемся да іншых, дакументальных крыніц інфармацыі, дык знойдзем шмат прыкладаў нечуваных дагэтуль на зямлі паводзін узброеных людзей у дачыненні да мірнага насельніцтва. Ачмурэлыя ад пажады спажывы адкрывальнікі Новага Свету падчас шматлікіх далейшых экспедыцый ды рабскага закабалення карэнных народаў залілі кантыненты Амерыкі крывёю, завалілі трупамі нічым не вінаватых людзей. Напрыклад, у Іспаньёле, дзе да 1492 года ў суладдзі з райскай прыродай шчасліва жылі каля 9 мільёнаў таінас, к 1570 году засталося ўсяго дзве лядашчыя вёсачкі карэнных жыхароў, пра якіх Калумб у свой час пісаў: «лепшых і такіх ласкавых на свеце людзей няма».

Ёсць пісьмовае сведчанне і з другога боку, з кнігі мая Чылам Балам: «Калі белыя спадары прыйшлі на нашу зямлю, яны прынеслі страх і завяданне кветак. Яны знявечылі і згубілі квецень іншых народаў... Марадзёры днём, злачынцы па начах, забойцы свету».

Вядомы амерыканскі гісторык Дэвід Станард у кнізе «Амерыканскі Халакост» піша, што самыя ўдалыя, калі іх можна так назваць, з народаў Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі сёння захавалі не больш за 5 працэнтаў ад сваёй ранейшай колькасці.

Іспанскія каланісты вешалі, засмажвалі на ражнах, спальвалі індзейцаў на кастрах, секлі людзей на кавалкі і кармілі сваіх сабак. Ці проста секлі без дай прычыны... Хаця не, так яны правяралі вастрыню толькі што наточаных на прыбярэжных камянях мячоў. Дэвід Станард падлічыў, што сярэдняя працягласць жыцця збіральнікаў кокі, індзейскіх рудакопаў доўжылася не больш за тры ці чатыры месяцы. Прыкладна такі ж тэрмін жыцця быў і ў паднявольных рабочых фабрыкі сінтэтычнай гумы ў Асвенцыме ў 1943 годзе.

Вынішчэнне еўрапейцамі карэннага насельніцтва двух амерыканскіх кантынентаў, на думку даследчыкаў, з'явілася самым масавым і доўгім генацыдам у сусветнай гісторыі. Так што Гітлеру было ў каго павучыцца.

Але аблуднае памкненне ўзяцца за Божую справу і пабудаваць ці знайсці гатовы рай на зямлі або нешта падобнае да яго застаецца з чалавекам. І геаграфічны падыход да ажыццяўлення мары-мэты цяпер, у эру немагчымага пры Калумбе развіцця камунікацый, па-ранейшаму з'яўляецца вельмі спакуслівым. Многія ж людзі з усіх куткоў свету і па сёння лічаць Амерыку гістарычна аформленым райскім надзелам. Іх зусім не засмучае той факт, што «цемнаскурыя анёлы» ратуюцца ў рэзервацыях. Хоць, можа, гэтае міжвольнае і своеасаблівае адцуранне ад вычварэнскага свету індзейцы і сапраўды лічаць своеасаблівым райскім затулкам. Прынамсі, у параўнанні з лёсам сваіх далёкіх продкаў.

Ну а што мае родныя беларусы, людзі, якія не маюць свайго марскога ўзбярэжжа і, адпаведна, расцуглянай геапалітычнай ініцыятывы? Якое ў іх прымерванне да ўзорнага жыцця першалюдзей, якіх Бог надзяліў было сваім блаславёным затулкам?

Звужу адказ на гэтае пытанне сардэчна цёплымі межамі роднасці і скажу толькі пра пакаленне маёй мамы, людзей, якія перажылі Вялікую Айчынную вайну.

Мама, патомная сялянка, старанная калгасніца, ніколі не думала пра райскае жыццё. Нават не сніла яго. Яна толькі заўсёды баялася, каб зноў не вярнулася пекла, і, як многія беларускі ейнага веку, пры ўсіх жыццёвых нягодах і выпрабаваннях толькі і ведае, што як малітоўны рэфрэн паўтарае: «Абы не было вайны...» Маўляў, і нішчымніцу перажывём, і голад, і холад, толькі б не загрымела смяротным громам неба, не ператварылася родная зямелька ў пякельную патэльню, толькі б не ахвяраваць сваімі сынкамі дзеля яе ратавання... Некаторыя глабальныя людзі з пакалення next наракаюць на бабулек: «От жа, вам усё адно, як мы жывём і як хочам жыць, толькі і ведаеце: абы вайны не было...» А я ж не наракаю.

Мая старэнькая матуля ўжо другі год жыве са мной у гарадской кватэры. Нямоглая, на вуліцу выходзіць рэдка, усё сядзіць у сваім пакойчыку ды глядзіць тэлевізар, каб не так моцна заціскала сэрца самота. За свой гарадскі час маці наглядзелася тэлеперадач больш, чым за ўсё доўгае ад прыпару да прыпару — папярэдняе жыццё.

Аднойчы мама пасля таго, як перагледзела розныя вечаровыя навіны пра грамадскі неспакой у краінах свету, закалоты, памежныя сутычкі ды міжнацыянальную разню, узрушаная, не ўтрымала ў сабе балючую трывогу:

— А-я-яй, што робіцца... Мусіць, будзе вайна... — і запытальна і разгублена паглядзела на мяне.

— Не, — адказаў я. — Не будзе!

І раптам адчуў слабіну ў сваіх простых словах, іх непераканаўчасць і дадаў:

— Не, мама. Адкуль ты ўзяла? Не будзе аніякай вайны. Была ўжо...

А ўсё адно зніякавеў, бо міжволі згадаў радкі блізкага маёй душы рускага паэта Мікалая Рубцова, здарожаны лірычны герой якога (верш «Рускі агеньчык») у цёмнай глухмені пайшоў на святло ў акенцы і знайшоў начны прытулак з угрэўнай печчу, цёплай вопраткай у хаціне адзінокай бабулі. І пачуў ад яе такое самае пытанне:

«Огнём, враждой
Земля полным-полна,
И близких всех душа
не позабудет...
— Скажи, родимый,
будет ли война?
И я сказал: — Наверное, не будет.
— Дай бог, дай бог...
Ведь всем не угодишь,
А от раздора пользы не прибудет... —
И вдруг опять:
— Не будет, говоришь?
— Нет, — говорю, — наверное, не будет!
— Дай бог, дай бог...»

Вось гэтае «напэўна», такое зашмальцаванае і такое далікатна-трапнае ў гэтым кантэксце слова і развярэдзіла маю душу. Але хіба мог я сказаць яго маме, хіба павінен я гаварыць з ёй так, як хочацца пісаць...

Калі разабрацца, дык і для мяне сёння галоўнае — абы не было вайны.

Праўдзівае разуменне раю дадзена толькі шчырым вернікам. Чалавек, які надзелены духоўным зрокам, бачыць у Божым блаславёным кутку не толькі затулак ад хвароб і смерці, не толькі вызваленне ад зморных клопатаў па здабыванні хлеба на кожны дзень, не толькі атуляльную, сатканую з душэўнага спакою і лагоды, пялюшку, не толькі дзіцячае дурэнне пад шапатлівым Дрэвам Жыцця ў дзіўнай суладнасці з усімі жывымі істотамі, калі можна, як катуську, пачасаць за вухам тыгра... Не толькі... Ён разумее, што рай — найперш месца сустрэчы з Богам ды поўныя святла з Ягонай ласкі і спагады размовы з Ім... Не раўнуючы, як было ў Адама з Евай да выгнання: Госпад прыходзіў да іх штовечар, гутарыў, патлумачваў што да чаго ў свеце, настаўляў на правільнае жыццё як клапатлівы бацька. А ў рэшце рэшт, раззлаваны непаслухмянствам, выправіў свавольнікаў у поўны небяспекі свет, як людзі бывае выпраўляюць з дому шкадлівых дзетак-пераросткаў. Засталося толькі святло са шчыліны прыадчыненых — перш за ўсё нашым ўяўленнем — дзвярэй у Ягоны запаветны куток. Грукаць у дзверы не трэба: ідзі па жыцці праведным шляхам, расці дзяцей, любі людзей, не рабі ім зла, бойся Бога — і дзверы ў ягонае царства адчыняцца. ...Пасля непазбежнага для кожнага чалавека апошняга імгнення, якое напоўніцца не падуладнай усведамленню, існай і страшнай сваёй глыбінёй вечнасцю.

А святло са шчыліны прыадчыненых дзвярэй бруіцца і бруіцца...

Душа ўлагоджваецца існаваннем на свеце ўнучкі і ўнука, дочак і матулі...

З алоўка ў начной цішы саслізгваюць на чысты аркуш пялёсткамі райскай квецені родныя словы...

Лісцінку маёй гумавай лодкі павольна нясе ласкавая плынь Касплі: ад адной кветкавай купіны — да другой, ад аднаго спеўнага птушынага хмыза — да новага, не менш рознагалосага, ад самовага віра — да шчупачынага, ад вёскі да вёскі, у якіх жывуць прыхільныя, як радня, людзі...

Мілагучная Каспля падалася мне аднойчы рукавом райскай плыні...

Калі я скажу, што рай на зямлі — гэта Радзіма, хто мне паверыць?..

■ Бяспека руху

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫ ДЗЯЦЕЙ АД НЕПРЫЕМНАСЦЯЎ НА ДАРОГАХ?

Летнія канікулы адлічваюць свае апошнія дні. Крыху больш чым праз тыдзень на заняткі адправяцца сотні тысяч школьнікаў. Цяпер жа многія з іх паступова вяртаюцца дадому пасля доўгага адпачынку ў вёсцы. Гэты час лічыцца ў інспектараў дарожнага руху адным з самых напружаных: усё-такі дзеці, знаходзячыся па-за межамі вялікіх гарадоў, адвыклі ад імклівасці іх вуліц. А наперадзе ў школьнікаў яшчэ штодзённыя падарожжы з дому на заняткі і назад. Дык як жа засцерагчы дзяцей ад непрыемнасцяў на дарогах?

— З 26 жніўня па 6 верасня ў краіне, па традыцыі, будзе праводзіцца комплекс мерапрыемстваў «Увага — дзеці!». Мы заклікаем кіроўцаў аўтатранспарту ездзіць у гэты час з уключаным бліжнім святлом фар, каб школьнік мог бачыць аўтамабіль здалёк, — гаворыць **старшы інспектар па асобых даручэннях упраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Ганна БАНАДЫК.**

З пачатку года на беларускіх дарогах загінулі 13 дзяцей, а яшчэ 261 юны ўдзельнік дарожнага руху атрымаў траўмы. Увогуле зараз супрацоўнікі ДАІ назіраюць дзіўную тэндэнцыю. Калі яшчэ сем-восем гадоў таму два з кожных трох ДТЗ адбываліся па неабачлівасці дзяцей, то зараз гэтую сумную пальму першынства перахапілі кіроўцы. Гэта сведчыць аб тым, што школьнікі пачалі больш свядома паводзіць сябе на праезнай частцы.

З пачатку года на дарогах загінулі 13 дзяцей, траўмы атрымаў 261 юны ўдзельнік дарожнага руху.

У кожнай школе абавязковымі сталі куткі бяспечнага руху, дзе на стэндах намалявана схема мікраёна з найбольш бяспечнымі маршрутамі дадому. Гэтыя шляхі пракладаюцца з улікам таго, каб вучні пераходзілі як мага менш дарог.

Сёлета школьнікаў у першы вераснёвы тыдзень чакаюць спецыяльныя лінейкі і пазакласныя гадзіны, на якіх інспектары яшчэ раз нагадаюць дзецям правілы дарожнага руху. Але цяпер вучням тлумачаць не толькі абавязкі пешахода, але і пасажыра. Яно і не дзіўна: знайсці сям'ю, дзе б не было аўтамабіля, з кожным годам усё складаней. Ды вось толькі бацькі часам грэбуюць правіламі: возяць маленькіх сыноў ці дачок без спецыяльных аўтакрэслаў ці ўвогуле на руках, не прышпільваюць іх рамянямі бяспекі на заднім сядзенні. А расплачваюцца за гэтую неахайнасць дзеці... Не забываюцца інспектары і на юных кіроўцаў.

— Калі мы ўводзілі некалькі гадоў таму абавязковае атрыманне правоў на кіраванне мапедамі, то з гэтай нагоды ў наш адрас гучала шмат крытыкі, — працягвае Ганна Банадык. — Аднак сёння мы бачым, што гэтае рашэнне было правільным, бо дарожна-транспартныя здарэнні з удзелам непаўналетніх кіроўцаў можна зараз пералічыць на пальцах.

Інспектары нават узялі на ўзбраенне такты пакватэрнага абходу юных вадзіцеляў. У прысутнасці бацькоў такія кіроўцы ставяць подпіс пад папярэджаннем, што яны валодаюць сродкам павышанай небяспекі.

Супрацоўнікі ДАІ гавораць без залішняга пафасу: правілы дарожнага руху напісаны крывёй тых, хто іх парушае. Таму найлепшы спосаб засцерагчы сябе ад непрыемнасцяў на дарозе — быць пільным і сумленным.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоэтажный жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения и многоуровневой гараж-стоянкой № 3 по генплану по пр. Дзержинского в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожной – пер. Разинского – пер. 1-го Извозного» (1-я очередь, без строительства ТП № 40.6 по генплану),

опубликованную в газете «Звязда» 17.12.2011 года, газете «Рэспубліка» 25 ноября 2011 года»

Застройщик: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09.***

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 1-, 2-, 3-комнатные квартиры.

Стоимость 1 кв.м 1-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 650 (одна тысяча шестьсот пятьдесят) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 600 (одна тысяча шестьсот) долларов США.

Стоимость 1 кв.м 2-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 600 (одна тысяча шестьсот) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 550 (одна тысяча пятьсот пятьдесят) долларов США.

Стоимость 1 кв.м 3-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 500 (одна тысяча пятьсот) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 450 (одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США.

По соглашению сторон оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка.

УНП 100070331

06.09.2013 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. О списании дебиторской задолженности.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 30.08.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400022625

УНП 100092167

Предложение о покупке акций ОАО «Центроэнергомонтаж»

Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица)	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»**
Место жительства (местонахождение для юридического лица)	**220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Наименование и местонахождение эмитента	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033 г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Цель приобретения акций	**Сокращение общего количества акций для последующего аннулирования**
Количество приобретаемых простых (обыкновенных) акций (штук)	**10 000**
Цена приобретения (белорусские рубли)	**200 000**
Сроки, форма и порядок расчета	**Оплата производится в течение 30 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи. Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций.**
Адрес, по которому будут представляться предложения акционеров и заключаться договоры купли-продажи акций	**г. Минск, переулок Велосипедный, д. 7**
Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций	**Со 2 сентября 2013 года по 13 сентября 2013 года**
Даты начала и окончания покупки акций	**С 17 сентября 2013 года по 31 октября 2013 года**